*На скрыжаванні культур*

# АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ СУПРАЦОЎНІЦТВА КІТАЯ І БЕЛАРУСІ Ў ГАЛІНЕ АРХІТЭКТУРЫ І ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

Артыкул прысвечаны разгляду асноўных кірункаў міжнароднага супрацоўніцтва Кітая і Беларусі ў галіне архітэктуры і выяўленчага мастацтва. Аналізуюцца асноўныя формы ўзаемадзеяння паміж краінамі: выставачная дзейнасць, мерапрыемствы ў рамках культурных абменаў па праграме супрацоўніцтва гарадоў-пабрацімаў, сустрэчы з вядомымі кітайскімі і беларускімі мастакамі, майстар-класы, а таксама тэматычныя вечары, галоўная мэта якіх – знаёмства беларусаў з асноўнымі кірункамі ў развіцці кітайскага выяўленчага мастацтва і кітайцаў з жанравай спецыфікай беларускага жывапісу і скульптуры.

Ключавыя словы: *міжнароднае супрацоўніцтва, Кітай, Беларусь, архітэктура, выяўленчае мастацтва, выставачная дзейнасць.*

The article reviews basic areas of international cooperation between China and Belarus in the field of architecture and fine arts. It analyzes the main forms of cooperation between Belarus and China: exhibition activity, cultural exchange events under the program of cooperation of sister cities, meetings with well-known Chinese and Belarusian artists, master classes, as well as theme nights, the main purpose of which is to acquaint Belarusians with the main trends in the development of Chinese fine arts and Chinese with the genre specifics of the Belarusian painting and sculpture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыя супрацоўніцтва Кітая і Беларусі ў сферы пластычных відаў мастацтва пачалася з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі ў 1992 г. Магутны імпульс да культурнага ўзаемадзеяння быў дадзены 25 лістапада таго ж года пасля падпісання ўрадамі "Пагаднення аб культурным супрацоўніцтве" [1], якое стала праграмным дакументам, што рэгулюе адносіны дзвюх дзяржаў у галіне культуры. На падставе гэтага пагаднення Міністэрствы культуры Беларусі і Кітая заключылі яшчэ шэсць, якія сталі прававой асновай супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння краін у пластычных відах мастацтва.

Беларускія даследчыкі пачалі актыўна займацца вывучэннем культурных сувязяў Беларусі з іншымі краінамі ў 1990-я гг. Праблематыка культурнага супрацоўніцтва знайшла адлюстраванне ў працах Д. Крывашэя, прысвечаных даследаванню кірункаў і форм культурных сувязяў Рэспублікі Беларусь з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы [2]. Асноўныя тэндэнцыі міжнароднага культурнага ўзаемадзеяння Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы пададзены ў працы "Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь (1991 – 2011 гг.)" У. Снапкоўскага і В. Лазоркінай [3], дзе еўрапейскі вектар культурнага супрацоўніцтва Беларусі дапоўнены ўсходнім кірункам. Закранаючы развіццё беларуска-кітайскіх культурных стасункаў, аўтары засяродзілі ўвагу на аналізе прававой базы двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне культуры і мастацтва, дзейнасці Міністэрстваў замежных спраў і культуры Рэспублікі Беларусь, традыцыйных і наватарскіх формах культурных сувязяў. Разам з поспехамі, дасягненнямі і пазітыўнымі тэндэнцыямі ў культурным супрацоўніцтве У. Снапкоўскі і В. Лазоркіна адзначылі і шэраг недахопаў у гэтай галіне (адсутнасць агульнай канцэпцыі, стратэгічнага планавання і сістэмнага характару ў развіцці культурных сувязяў паміж дзвюма краінамі; недастаткова актыўная дзейнасць беларускага пасольства ў КНР у прасоўванні беларускіх культурных каштоўнасцей у розных рэгіёнах Кітая).

Нягледзячы на тое, што беларуска-кітайскія сувязі ў галіне культуры і культурнай дзейнасці ў апошнія гады рэалізуюцца досыць актыўна і плённа, сёння адчуваецца востры дэфіцыт значных навуковых даследаванняў па гэтай праблематыцы. Як паказвае агляд навуковых крыніц, тэма беларуска-кітайскіх узаемаадносін акрэсліваецца пераважна палітыка-эканамічнымі стасункамі дзвюх краін, а тэма культурных сувязяў практычна не закранаецца. Выключэнне складаюць толькі згаданае даследаванне У. Снапкоўскага і В. Лазоркінай, а таксама працы В. Мацэля. Так, у яго манаграфіі "Станаўленне і развіццё дружалюбных беларуска-кітайскіх адносін" [4] не толькі дэталёва прааналізаваны сучасны стан беларуска-кітайскага культурнага супрацоўніцтва, але і на канкрэтных гістарычных фактах і прыкладах даследавана дынаміка развіцця стасункаў паміж Беларуссю і КНР ва ўсіх сферах двухбаковага супрацоўніцтва ад гістарычнай рэтраспектывы да сучаснасці. Аднак разам з тым неабходна адзначыць, што даследаванні форм узаемадзеяння ў галіне архітэктуры і выяўленчага мастацтва да гэтага часу не праводзіліся.

Мэта артыкула – выявіць асноўныя кірункі супрацоўніцтва Кітая і Беларусі ў галіне архітэктуры і выяўленчага мастацтва.

Архітэктура – стылеўтваральны від мастацтва і ў кожнай краіне мае нацыянальныя асаблівасці. Узаемадзеянне Кітая і Беларусі ў гэтай сферы накіравана на прыўнясенне нацыянальных рыс сваёй краіны ў аблічча гарадоў краіны-партнёра.

У апошнія гады Кітай актыўна ўдзельнічае ў конкурсах архітэктурных праектаў у Беларусі, хоць не ўсе з іх прыняты да рэалізацыі. Сярод самых значных конкурсных прапаноў кітайскіх архітэктараў можна назваць праекты новай узлётна-пасадачнай паласы і рэканструкцыі верхняга ўзроўню будынка Нацыянальнага аэрапорта, мікраараёнаў “Лебядзіны”, “Мінск-Сіці”, “Маяк”, спарткомплексу на вуліцы Каліноўскага ў Мінску, індустрыяльнага парку ў Смалявіцкім раёне, гандлёва-забаўляльнага цэнтра ў мінскім мікрараёне Усход, цэментнага завода і адміністрацыйных будынкаў у Крычаве, комплексу будынкаў у раёне “Мінск-Арэны”, пяцізоркавага гатэля “Пекін”, жылога комплексу ў Віцебску, шэрага аб’ектаў у Жлобіне і інш.

Значным праектам, у якім удзельнічаюць кітайскія архітэктары, з’яўляецца забудова мінскага мікрараёна “Лебядзіны” каля возера Драздзы. Пры яго ўзвядзенні выкарыстоўваюцца элементы кітайскай архітэктуры, нестандартная планіроўка і новыя архітэктурныя рашэнні. Так, напрыклад, калі ўздоўж праспекта Пераможцаў, па задуме беларускіх і кітайскіх архітэктараў, будуюцца шматпавярховыя памяшканні, то ўнутраная “начынка” мікрараёна “Лебядзіны” складаецца з жывапісных груп жылых комплексаў, што чаргуюцца з кварталамі індывідуальнай забудовы з “украпінамі” аб’ектаў грамадскага прызначэння. Плануецца, што адным з самых знакавых стане жылы комплекс “Чайна-таўн”, дзе будуць арганічна злучаны асноўныя рысы нацыянальных культур Беларусі і Кітая. Забудоўшчык комплексу – кітайская кампанія “Чжун-Цінь-Аб’яднанне”. У афармленні зялёных зон мікрараёна “Лебядзіны” выкарыстоўваюцца кітайскія садоўніцкія элементы: штучныя горкі, шчэбеневыя дарожкі, гексаганальныя альтанкі і інш. Гэты раён не будзе рэзка выбівацца з архітэктурнага аблічча Мінска. Мяркуецца, што ён лёгка ўпішацца ў вобраз еўрапейскага горада, але ў той жа час у ім можна будзе беспамылкова пазнаць кітайскі стыль: невялікія кратаваныя акенцы, збудаванні малой формы, альтанкі. У Чайна-таўне будзе шмат зеляніны, кварталы звяжа паміж сабой сістэма бульвараў. Вакол вадаёма размесцяцца 4 – 6-павярховыя жылыя дамы, а са знешняга боку раёна – 9 – 11-павярховыя. Кітайскія архітэктары наўмысна адышлі ад ідэі ўзвядзення 20-павярховых дамоў, бо імкнуліся зрабіць жылую забудову суразмернай чалавеку. Менавіта сярод невысокіх дамоў, на думку кітайскіх аўтараў, чалавек пачувае сябе больш камфортна, а таксама адчувае ўласную значнасць [5]. Несумненна, што ўвасабленне гэтага праекта ў жыццё разнастаіць архітэктурнае аблічча Мінска, дадасць беларускай сталіцы кітайскага архітэктурнага каларыту.

З рэалізаваных праектаў варта адзначыць узвядзенне гасцінічнага комплексу “Пекін”. Ён размешчаны на маляўнічым беразе ракі Свіслач сярод цудоўнага парку. Будынак з яго белымі сценамі і цёмна-шэрым дахам у стылістыцы кітайскіх дворыкаў спалучае ў сабе асаблівасці сучаснага гасцінічнага комплексу і традыцыйнай кітайскай архітэктуры. Гасцініца бізнес-класа “Пекін” прапануе гасцям не толькі камфортныя і стыльныя нумары, але і канферэнц-залы, і пакоі для перамоў, правядзення бізнес-сустрэч, таксама выкананыя ў кітайскім нацыянальным стылі.

Сярод беларускіх архітэктурных задум, прынятых да рэалізацыі на тэрыторыі КНР, у першую чаргу вылучым футурыстычны праект гасцініцы з начным клубам у Ганконгу. Гэты праект, распрацаваны беларуска-чэшскай архітэктурнай майстэрняй “Urbanplunger”, у 2012 г. атрымаў трэцюю прэмію ў міжнародным конкурсе “Архітэктура і горадабудаўніцтва” ў Кітаі. Асноўная ідэя праекта геніяльная і простая: у сувязі з недахопам свабодных плошчаў для забудовы ў густанаселеным мегаполісе, якім з’яўляецца Ганконг, будынак гасцініцы будзе ўзняты над зямлёй і абапрэцца на суседнія, ужо ўзведзеныя памяшканні. Менавіта такая прапанова, на думку аўтараў, зможа, па-першае, зрабіць праект больш танным, а па-другое, вырашыць праблему недахопу тэрыторыі ва ўмовах шчыльна забудаванага горада. Футурыстычная архітэктура падвешанага будынка развівае тэму ў кірунку шматфункцыянальнасці. Зялёная зона, размешчаная пад канструкцыяй гасцініцы, стане дадатковым месцам адпачынку. Кампазіцыя ўсяго праекта – своеасаблівы архітэктурны “паразіт”, які абапіраецца на суседнія дамы і выкарыстоўвае іх унутраную інфраструктуру. Унікальны будынак звязаны з зямлёй з дапамогай ліфтаў, якія паднімаюцца ў вестыбюль праз зону начнога клуба. Увесь цяжар будаўніцтва, згодна з праектам, кладзецца на суседнія памяшканні і апорныя элементы, што фарміруюць “крылы” шматмэтавай канструкцыі. Гэта дае магчымасць падвешанаму хмарачосу, створанаму з лёгкіх і трывалых кампазітных матэрыялаў, развівацца вертыкальна і гарызантальна [6]. Дзякуючы звужэнню цэнтральнай часткі будынка ў гасцінічных нумарах на верхніх паверхах прадугледжаны дадатковыя балконы і тэрасы. Архітэктурны праект быў ухвалены ўладамі Ганконга і прыняты да рэалізацыі.

Гісторыя перапляцення архітэктурных традыцый Кітая і Беларусі сведчыць пра тое, што супрацоўніцтва краін у гэтай галіне можа плённа развівацца.

Ва ўзаемадзеянні ў выяўленчым мастацтве цалкам захаваны парытэт, і, як правіла, выста-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

вы беларускіх майстроў у Кітаі суправаджаюцца сустрэчнымі паказамі кітайскіх мастакоў у Беларусі.

Кітайскае выяўленчае мастацтва даволі шырока прадстаўлена ў выставачнай прасторы Беларусі. Пачатак імкліваму развіццю ў сферы культурных абменаў і візітаў кітайскіх майстроў жывапісу ў Беларусь і беларускіх мастакоў у Кітай быў пакладзены дзесяць гадоў таму. У верасні 2006 г. у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адбылася выстава, дзе 42 мастакі прадэманстравалі мастацтва кітайскага нацыянальнага жывапісу "гохуа" ў пейзажным жанры "лёд і снег". Унікальнасць гэтага кірунку заключаецца ў выкарыстанні стылю, створанага на аснове традыцыйнага пейзажнага жывапісу "шань-шуй" ("горы і воды"), і наватарскага падыходу да традыцыйнай тэхнікі малявання тушшу, што адпавядае сучасным эстэтычным уяўленням. Мастацкай мове пейзажнага жывапісу "лёду і снегу" ўласціва яркае праяўленне прыгажосці і эстэтычных характарыстык белага колеру ў выяве снегу. Беларускія гледачы мелі магчымасць пазнаёміцца з карцінамі, якія дэманстравалі рысы традыцыйнага манахраматычнага выяўленчага мастацтва ў сучасным жывапісе Кітая.

Насычаным для беларускіх аматараў кітайскага выяўленчага мастацтва стаў 2012 год, калі адбылася цэлая серыя экспазіцый кітайскага жывапісу. Так, у студзені ў Палацы мастацтваў была праведзена чарговая выстава кітайскага манахраматычнага жывапісу "Вядомыя кітайскія каліграфы і жывапісцы ў Мінску", дзе было паказана 30 твораў 15 кітайскіх мастакоў, у тым ліку працы такіх сусветна вядомых майстроў, якія працуюць у стылі нацыянальнага жывапісу "гохуа", як Ма Чжэньшэн, Ван Цзюньшань, Лі Бааліні Німацзэжэнь.

У сакавіку 2012 г. у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылася выстава шэдэўраў знакамітага кітайскага жывапісца Лю Хайху, прымеркаваная да 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь. У экспазіцыі "Чароўнасць Усходу" ўдзельнічалі 30 найлепшых прац майстра, выкананых тушшу і мінеральнымі фарбамі ў жанры "сеі" ("жывапіс ідэй"). Сярод твораў кітайскага мастака былі паказаны як мініяцюры на веерах, так і палотны, прычым усе экспанаты напісаны з выкарыстаннем традыцыйных тэхнік кітайскага жывапісу. Асноўныя вобразы карцін – кветкі, птушкі, горы і рэкі. Самае дарагое палатно на гэтай выставе – "Кветкі лотаса" – мастак падараваў Нацыянальнаму мастацкаму музею. Гэты падарунак мае глыбокі сімвалічны сэнс, бо ў нацыянальнай свядомасці кітайцаў лотас – гэта кветка, што сімвалізуе мір, гармонію і сяброўства.

Значныя выставы твораў кітайскага жывапісу прайшлі ў Беларусі ў 2015 г. У студзені ў Галерэі мастацтваў у Мінску адбылася выстава жывапісу маладых кітайскіх мастакоў "Паэзія колеру". Яе арганізатарам і непасрэдным удзельнікам выступіў Ян Лімін, член міжнароднага культурнага фонду кітайскай правінцыі Шаньдун. На выставе былі прадстаўлены працы Ян Шо, Лю Ён, Сунь Кай, Чжоу Лііна, Лі Сіньчжоў і Ян Цон'ю. У творах гэтых мастакоў панавала сапраўднае жывапіснае захапленне і адчувалася непадробная цікавасць да паэтыкі каларыстычных вопытаў. У кожнага з аўтараў вызначылася сваё кола тэм, уласная манера пісьма і стыль.

У сакавіку 2015 г. у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь прайшла выстава вядомага кітайскага мастака і каліграфа Лян Юнхэ, якога на радзіме называюць "вандроўнікам на краі свету". Яго карціны вылучаюцца тонкай манерай пісьма, своеасаблівай, арыгінальнай тэхнікай выканання. У іх пераважае жанр "кветкі і птушкі". Вытанчаным і элегантным працам Лян Юнхэ ўласцівы тонкія танальныя пераходы, выявы надзвычайна праўдападобныя. Пазіраючы на карціны мастака, глядач захапляецца не толькі віртуознасцю пэндзля, але і прыгажосцю паэтызацыі асноўнай ідэі твора.

Выставачная дзейнасць беларускіх мастакоў крыху саступае ў маштабнасці і прадстаўнічасці кітайскім калегам. Беларускія творцы ўдзельнічаюць пераважна ў выставах, якія арганізуюцца ў рамках дзён беларускай культуры ў Кітаі.

Найбольш значнай для беларускіх мастакоў была выстава "Сучаснае мастацтва алейнага жывапісу Беларусі", якая адбылася ў ліпені 2008 г. у Выставачнай зале культуры і мастацтваў Пекінскай бібліятэкі. Яна стала не толькі адной з найважнейшых падзей у рамках дзён нацыянальнай беларускай культуры ў Кітаі, але і праграмным мерапрыемствам культурнага праекта "Сустрэча з Пекінам – 2008". На выставе было паказана 27 палотнаў сучасных майстроў беларускага алейнага жывапісу: Віктара Альшэўскага, Уладзіміра Зінкевіча, Уладзіміра Савіча, Уладзіміра Тоўсціка і Валерыя Шкарубы. Іх творы прадэманстравалі не толькі глыбокія карані і доўгую гісторыю беларускага мастацтва жывапісу, але і цудоўную тэхніку, непаўторны стыль і нястомныя творчыя пошукі сучасных беларускіх мастакоў [7].

З 25 кастрычніка да 4 лістапада 2012 г. у Музеі сучаснага мастацтва Хунцяа ў Шанхаі ў рамках 14-га Міжнароднага фестывалю мастацтваў прайшла выстава твораў беларускага жывапісу, выкананых у стылі мадэрн. У выставе ўзялі ўдзел дванаццаць беларускіх мастакоў. Іх творы

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

розных перыядаў ілюстравалі развіццё творчага стылю ад рэалізму да фармальнага рэалізму і дэманстравалі вялікую сюжэтную разнастайнасць, уключыўшы контурныя малюнкі, эскізы, гравюры і акварэлі, выкананыя гуашшу ў жанры графіці [8]. Кітайскія аматары жывапісу атрымалі рэдкую магчымасць зразумець і асэнсаваць апошні від мастацтва, які для Кітая – адносна новая з'ява. У той жа час графічныя працы беларускіх мастакоў у пэўных рысах аказаліся сугучнымі з творамі кітайскіх майстроў, якія працуюць у манахромным жывапісе.

Не менш плённай стала выставачная дзейнасць беларускіх скульптараў. Калі прааналізаваць працы, якія бралі ўдзел у выставах у Кітаі, напрыклад "Вялікая мяжа" і "Слон" Максіма Петруля, "Партрэт жыцця" Максіма Макарэвіча, "Раўнавага" Віктара Копача, "У лодцы" Уладзіміра Слабодчыкава, то можна выразна адчуць, што на іх значна паўплывала кітайская філасофія.

Новай перспектыўнай формай узаемадзеяння дзвюх краін у галіне графікі стала супрацоўніцтва беларускіх ілюстратараў з кітайскімі выдавецтвамі. Найбольш удалым вопытам стала супрацоўніцтва Паўла Татарнікава і Уладзіміра Даўгялы з тайваньскім выдавецтвам "Гэлінь", дзе яны праілюстравалі пяць кніг казак. Кітайскія выдавецтвы арыентуюцца пераважна на нацыянальную традыцыйную культуру і выкарыстоўваюць творчыя рэсурсы мастакоў-ілюстратараў з розных краін свету.

Акрамя выставачнай дзейнасці, у галіне культурнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем назіраюцца і іншыя формы ўзаемадзеяння. У Беларусі гэтыя мерапрыемствы ў асноўным адбываюцца пры актыўным удзеле дыпламатычнай місіі КНР у Беларусі і Інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя, у Кітаі – пад патранажам Пасольства Рэспублікі Беларусь у Пекіне. Сярод найбольш значных падзей можна назваць:

– тэматычныя выставы жывапісу і сустрэчы з мастакамі з гарадоў-пабрацімаў – Магілёва і Нанкіна (красавік 2015 г.); мерапрыемствы праходзілі на базе Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя П. Масленікава і Нанкінскай галерэі мастацтваў;

– майстар-класы па навучанні тэхніцы "гохуа" з удзелам вядомых кітайскіх мастакоў. Прыкладамі такіх мерапрыемстваў могуць служыць майстар-клас вядомага мастака Сяа Юй у Інстытуце імя Канфуцыя пры Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, а таксама майстар-клас мастака Аа Тэ, які працуе ў жанры "хуаняа", у Магілёўскім ліцэі выяўленчых мастацтваў;

– майстар-класы кітайскай каліграфіі, што рэгулярна праводзяцца вопытнымі кітайскімі спецыялістамі ў Інстытуце імя Канфуцыя, школах, дзіцячых лагерах і іншых адукацыйных установах Беларусі. Павышаная цікавасць беларускай моладзі да каліграфіі тлумачыцца тым, што яна з'яўляецца важным элементам выяўленчага мастацтва Кітая і складае аснову традыцыйнага і сучаснага кітайскага жывапісу;

– культурныя моладзевыя абмены, якія арганізуюцца Інстытутам імя Канфуцыя і ставяць на мэце знаёмства кітайскай моладзі з шэдэўрамі беларускага выяўленчага мастацтва і архітэктуры, а беларускай моладзі – з кітайскім жывапісам і старажытнакітайскай архітэктурай.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што супрацоўніцтва Кітая і Беларусі ў сферы выяўленчага мастацтва з кожным годам робіцца ўсё больш цесным. Кітайскае выяўленчае мастацтва займае значнае месца ў выставачнай прасторы Беларусі. Дзякуючы агульнасці гуманістычных ідэй, увасобленых у працах кітайскіх мастакоў, кітайскае выяўленчае мастацтва блізкае беларускай публіцы і выклікае жывую цікавасць у гледачоў.

*Пераклад з рускай мовы.*

### Спіс літаратуры

1. **Соглашение о сотрудничестве между Правительством КНР и Правительством РБ от 22.11.1992 г.** // Сеть юридической библиотеки [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.law-lib.com/lawhtm/1992/77292.htm. – Дата доступа : 26.11.2014.
2. **Крывашэй, Д. А.** Нацыянальная культура ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы ў 1991 – 1996 гг. : некаторыя факты і падзеі / Д. А. Крывашэй // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва : інфарм.-аналіт. зб. Вып. 6; Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1997. – С. 4 – 28.
3. **Снапковский, В.** Международное культурное сотрудничество Республики Беларусь (1991 – 2011 гг.) / В. Снапковский, О. Лазоркина // Журнал международного права и международных отношений. – 2011. – № 4. – С. 32 – 40.
4. **Мацель, В. М.** Становление и развитие дружественных белорусско-китайских отношений / В. М. Мацель. – Барановичи : РУУП "Барановичская укрупненная типография", 2004. – 190 с.
5. **Никифорова, Т.** Не China, негаданно / Т. Никифорова // Белгазета. – 2010. – № 26 (749).
6. **Футуристический проект ночного клуба "паразита" в Гонконге от чешских и белорусских архитекторов** [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://ais.by/news/13940. – Дата доступа : 29.07.2015.
7. **Выставка белорусской современной масляной живописи в Столичной библиотеке в Пекине в 2008 году** // Сайт "Шоуду Тушугуань" [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.clcn.net.cn/modules/information/view.php?id=344. – Дата доступа : 11.12.2014.
8. **Выставка современной белорусской живописи в Шанхае** // Сайт "Ячан Ишу" [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://exhibit.artron.net/20121029/n276664.html. – Дата доступа : 11.12.2014.

**Ся ЛЭЙ,**
аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 4 ліпеня 2016 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ